**94.** Запішыце словы па-беларуску, растлумачце правапіс спалучэнняў галосных.

Клиент, бастион, патриот, реактив, библиотека, миллион, фразеология, идеология, регион, майонез, трио, биография, вариация, район, лауреат, биолог, рацион, ион, радио, официант, майор, археология, фиолетовый, спартакиада, периодика, проект, леопард, грандиозный, приоритет, йод.

**БІЯГРАФІЯ — АЎТАБІЯГРАФІЯ**

**Біягра́фія** — апісанне жыцця і дзейнасці каго-небудзь: *біяграфія мастака.*

**Аўтабіягра́фія** — апісанне свайго жыцця: *да заявы дадаецца аўтабіяграфія.*

Няправільнае ўжыванне: *напісаць сваю аўтабіяграфію* (правільна: *напісаць аўтабіяграфію*).

**95.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах.

1. Трэба ж нагаварыцца пра дзяцей, пра сон, пра гарод, пра серы*(а/я)*лы *(Г. Марчук).* 2. Канец прыгожай, пятлястай рачулцы прыйшоў неўзабаве пасля вайны, калі пачала разгортвацца мелі*(я/а)*рацыя *(А. Жук).* 3. У дзяцей бясконцыя «чаму?», а ў старых — успаміны, асацы*(а/я)*цыі *(Я. Брыль).* 4. Але хлопцы не праяўлялі ініцы*(а/я)*тывы *(І. Шамякін).* 5. У невялікім агародчыку каля самай хаты раслі кветкі: ружы, флёксы, астры, гладыя*(о/ё)*лусы *(Т. Мушынская).* 6. Пі*(я/а)*ністу быццам перадалася частка гэтай стыхійнай сілы *(Э. Луканскі).*

● Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе з абагульняльным словам пры аднародных членах.

**96.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

### Спявала душа народа

Тытулаў і званняў, пасад і ўзнагарод у яго было нямала: народны артыст СССР і Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, старшыня праўлення Саюза кампазітараў Беларусі... А сам Рыгор Раманавіч Шырма вышэй за ўсё ставіў сваё звычайнае захапленне — збіральнік і прапагандыст беларускай народнай песні.

Кожную магчымасць сустрэцца з людзьмі, запісаць самабытную[л] песню, прымаўку, загадку ці прыказку Рыгор Раманавіч выка-



Правообладатель Национальный институт образования

рыстоўваў спаўна, разумеючы важнасць гэтай творчасці для народа.




У 1929 годзе ён выдаў у Вільні першы збор нацыянальнага меласу* — «Беларускія народныя песні». У 1938 годзе апублікаваў зборнік «Наша песня». Як засведчылі тагачасныя перыядычныя выданні, кнігі мелі ў асяроддзі яго землякоў незвычайны поспех.

Амаль што да васьмідзесяцігадовага ўзросту кіраваў Рыгор Раманавіч Дзяржаўнай харавой капэлай*. У знак прызнання яго асабістых заслуг перад беларускім нацыянальным мастацтвам Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэле было прысвоена імя яе заснавальніка — Рыгора Раманавіча Шырмы *(Паводле А. Мяснікова)*.

Выпішыце з тэксту словы, напісанне якіх адпавядае правілам: а) «Правапіс галосных ***о, э, а***»; б) «Правапіс галосных ***е, ё, я***»; в) «Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах».

Разгледзьце выяву паштовай маркі, прысвечанай Р. Р. Шырму. Якія рысы характару адлюстраваны на яго твары? Пра што паведамляе малюнак у правай частцы маркі? Як вы лічыце, з якой мэтай на паштовых марках змяшчаюць партрэты выдатных асоб?

**97.** Напішыце зрокавы слоўнікавы дыктант па тэме «Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах».



Правообладатель Национальный институт образования